# Справаздача аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі.
# Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. П. К. ПАНАМАРЭНКА.

Таварышы!

З часу XVII з'езда комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі прайшло каля двух год. За гэты час як у галіне ўнутранага, так і ў галіне знешняга становішча Совецкага Саюза адбыліся падзеі велізарнага гістарычнага значэння.

Для ўсяго Совецкага Саюза гэты перыяд быў перыядам далейшага росту і росквіту, эканамічнага і культурнага ўздыму, перыядам далейшага ўмацавання ваеннай магутнасці і павышэння міжнароднага аўтарытэта Совецкага Саюза.

У сакавіку 1939 года адбываўся XVIII з'езд Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў.

Таварыш Сталін з трыбуны гістарычнага XVIII з'езда падвёў найвялікшыя вынікі барацьбы нашай партыі і многамільённага совецкага народа за выкананне плана другой пяцігодкі, за пабудову соцыялістычнага грамадства.

Даклад таварыша Сталіна заключае ў сабе неперадаўзыйдзены па глыбіні і яснасці аналіз шляху, пройдзенага нашай краінай, геніяльную характарыстыку міжнароднага і ўнутранага становішча соцыялістычнай дзяржавы. У дакладзе была начартана велічная праграма паступовага пераходу нашай краіны ад соцыялізма к комунізму.

Рашэнні з'езда і даклад таварыша Сталіна з'явіліся сцягам нашай работы за адчотны перыяд.

Увесь перыяд пасля XVIII з'езда ВКП(б) прайшоў пад знакам настойлівай і паслядоўнай барацьбы за рэалізацыю рашэнняў з'езда, за новыя поспехі прамысловасці і соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, за далейшы ўздым матэрыяльна-культурнага становішча мас.

У барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XVIII з'езда партыі совецкі народ яшчэ больш згуртаваўся вакол ВКП(б), совецкага ўрада і таварыша Сталіна. Выбары ў Вярхоўныя Советы СССР, БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных з новай сілай прадэманстравалі растучае маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, узмацненне совецкай дзяржавы, несакрушымую сілу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У гэты-ж перыяд партыя разгарнула велізарную работу па ідэйнаму ўзбраенню сваіх радоў, на аснове сталінскага «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», выклікаўшага перабудову партыйнай прапаганды і значнае ажыўленне палітыка-выхаваўчай работы ва ўсёй партыі.

У галіне міжнароднай палітыкі Совецкі Саюз, следуючы мудрым указанням таварыша Сталіна, дабіўся буйнейшых поспехаў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Совецкі Саюз, няўхільна праводзячы палітыку міру, сарваў планы правакатараў вайны, прывыкшых заграбаць жар чужымі рукамі. Каварныя проіскі англа-французскіх імперыялістаў, якія прабавалі ўцягнуць СССР у крывавую бойню, былі выкрыты. Партыя і ўрад прынялі ўсе неабходныя меры для забеспячэння безапаснасці нашай радзімы.

Старанні англа-французскай дыпламатыі ўцягнуць СССР у канфлікт з Германіяй пацярпелі крах. Заключэннем дагавора аб ненападзе паміж СССР і Германіяй быў пакладзен канец ненармальным адносінам, існаваўшым на працягу раду год паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. Тым самым была ўмацавана справа міру і расстроены планы падпальшчыкаў вайны.

Велізарнае значэнне мелі падзеі, якія разыграліся ў цэнтры Еўропы ў верасні 1939 года і завяршыліся ваенным разгромам Польшчы і распадам польскай дзяржавы. Падзеі, выкліканыя польска-германскай вайной, ускрылі да канца ўнутраную гніласць і несастаяцельнасць польскай дзяржавы. На працягу якіх-небудзь двух тыдняў польская дзяржава пацярпела паўнейшы разгром.

Совецкі ўрад палічыў сваім свяшчэнным абавязкам праявіць клопаты аб лёсе адзінакроўных беларусаў і украінцаў, якія пражывалі ў былой Польшчы і знаходзіліся там на становішчы бяспраўных нацый, палічыў сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам беларусам і украінцам, якія апынуліся пад пагрозай разарэння і знішчэння.

Гэту вялікую вызваленчую місію з чэсцю выканала доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія.

У выніку—у дружную сям'ю народаў вялікага Совецкага Саюза ўвайшлі нашы адзінакроўныя браты—народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Ажыццёўлена векавая мара вялікага беларускага народа аб з'еднанні. Навекі пакладзен канец штучнаму расшчапленню беларускага народа.

Совецкая Беларусь павялічылася па сваёй тэрыторыі і насельніцтву амаль у два разы, ператварылася ў дзяржаву з 10-мільённым насельніцтвам, чаго не маюць многія еўрапейскія дзяржавы. Гэта адзін з самых выдатных поспехаў знешняй палітыкі Совецкага Саюза за апошні час.

Гэтымі сусветна-гістарычнымі перамогамі мы абавязаны тварцу беларускай дзяржаўнасці—найвялікшаму другу беларускага народа, правадыру і настаўніку таварышу Сталіну. **(Бурныя апладысменты).**

Паслядоўна ажыццяўляючы палітыку міру, совецкі ўрад заключыў пакты аб узаемадапамозе з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, зрабіўшы гэтым новы ўклад у справу міру і забеспячэння безапаснасці нашай радзімы.

Справацыраваная аб'еднанымі сіламі англа-французскіх імперыялістаў вайна ў Фінляндыі закончылася поўным разгромам фінскай белагвардзейшчыны. СССР у свой час прапаноўваў фінляндскаму ўраду заключыць дагавор на такіх умовах, якія ў роўнай меры былі выгадны для абодвух дзяржаў, не закраналі іх суверэнных правоў і забяспечвалі безапаснасць паўночна-заходніх граніц совецкай дзяржавы, у прыватнасці горада Ленінграда. Гэтыя перагаворы не прынеслі поспеху з прычыны яўна непрыязнай пазіцыі, якую заняў фін-

ляндскі ўрад пад уплывам англа-французскіх падпальшчыкаў вайны. Рашэнне пытання перайшло на палі вайны.

У гэтай вайне за забеспячэнне безапаснасці паўночна-заходніх граніц Совецкі Саюз меў справу не проста з фінскімі войскамі, а са з'яднанымі намаганнямі імперыялістаў раду краін, у першую чаргу англійскіх і французскіх.

Чырвоная Армія сакрушыла лінію Манергейма, пакрыла сябе неўвядальнай славай, як першая армія, у найцяжэйшых умовах праклаўшая сабе шлях праз вялікую магутную паласу ўмацаванняў, пабудаваных па апошняму слову тэхнікі і лічыўшыхся да гэтага часу непрыступнымі.

Чырвоная Армія нагалаву разграміла аб'еднаныя сілы праціўніка і сякія-такія антысовецкія планы, выпеставаныя падпальшчыкамі вайны, ліквідаваўшы ваенны плацдарм для нападу на Совецкі Саюз і на горад Ленінград.

У рэзультаце гераічных дзеянняў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, безапаснасць нашых паўночна-заходніх граніц забяспечана.

На аснове мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй да Совецкага Саюза адышлі Карэльскі перашэек і паўночнае ўзбярэжжа Ладажскага возера. Атрыманы ў арэнду на 30 год поўвостраў Ханко з тэрыторыяй вакол яго для стварэння там ваенна-марской базы СССР і т. д.

Здарылася тое, аб чым аднойчы гаварыў у адной са сваіх прамоў Ленін:

> «... калі совецкая ўлада робіць сваю прапанову адносна міру, да яе слоў і заяў абавязкова трэба адносіцца сур'ёзна, у адваротным выпадку будзе тое, што мы прапануем мір на ўмовах горшых, а атрымліваем гэты мір на ўмовах лепшых» (т. XXV, стар. 412).

Заключэннем мірнага дагавора з Фінляндыяй нанесен новы ўдар англа-французскім імперыялістам, разлічваўшым любой цаной уцягнуць Совецкі Саюз у вялікую вайну.

У дады час тэрыторыі, на якіх аб'еднанымі сіламі імперыялістаў розных дзяржаў быў створан магутны плацдарм для нападу на краіну Советаў, сталі совецкімі. З ачага вайны яны ператварыліся ў аплот міру і безапаснасці нашых паўночна-заходніх граніц.

Ідучы насустрач пажаданням працоўных Карэльскай рэспублікі, VI Сесія Вярхоўнага Совета СССР прыняла рашэнне аб пераўтварэнні Карэльскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюзную Карэла-Фінскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку з уключэннем у яе састаў тэрыторый, адышоўшых да СССР па мірнаму дагавору ад Фінляндыі.

У брацкую сям'ю саюзных рэспублік прыбавілася новая, дванаццатая Карэла-Фінская Саюзная Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

Рост магутнасці і знешнія поспехі Совецкага Саюза не даюць спакою ворагам. Англа-французскія падпальшчыкі вайны і іх прыслужнікі—соцыял-дэмакратычныя лакеі—прадпрымаюць усё, што ў іх сілах, для далейшага развязвання вайны. Другая імперыялістычная вайна, уцягнуўшая ў сваю арбіту больш палавіны чалавецтва, прадаўжае пашырацца з новай сілай, пагражаючы новымі незлічонымі няшчасцямі для народаў і знішчэннем мільёнаў людзейва ўгоду імперыялістам.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ваенны пажар перакінуўся на Скандынаўскі паўвостраў. Нарвегія ператварылася ў тэатр імперыялістычнай вайны. Вайна ідзе на тэрыторыі Галандыі і Бельгіі.

Падазроную вазню англа-французскія імперыялісты зараз зацеялі на Бліжнім Усходзе, у прыватнасці, у Сірыі. Яны ўсімі сіламі дабіваюцца ўтварэння новых ачагоў вайны супроць Совецкага Саюза.

Японскія імперыялісты, увергнуўшыя паўмільярда людзей у вайну, імкнуцца к захвату Галандскай Індыі. Амерыка чакае зручнага моманту, каб прымяніць выпрабаваны імперыялістычны прыём,— вырваць здабычу, карыстаючыся слабасцю абяссіленага праціўніка.

Страшэнны цяжар вайны буржуазія перакладае на плечы працоўных, супроць якіх пушчаны ў ход усе чорныя сілы рэакцыі. Рабочыя і сяляне капіталістычных дзяржаў на ўласным вопыце пераконваюцца ў імперыялістычным, рэакцыйным, антынародным характары вайны.

Усё больш спее нездавальненне працоўных мас палітыкай правячых буржуазных клік і іх агентуры, нездавальненне супроць здрадніцкіх паводзін лакеяў буржуазіі—сучаснай соцыял-дэмакратыі. Працоўныя свету з надзеяй глядзяць на Совецкі Саюз, як на міжнародную бацькаўшчыну працоўных, на магутны аплот міру, прагрэса, свабоды.

Прайшло нямнога больш года з таго часу, як на ўвесь свет прагучала сталінская характарыстыка міжнароднага становішча. Ход падзей, развіццё міжнародных адносін поўнасцю пацвердзілі геніяльны сталінскі прагноз.

Побач з далейшым умацаваннем вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, павышэннем яго міжнароднага аўтарытэта, расла, мацнела і развівалася Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка, развівалася і паляпшала сваю работу прамысловасць, умацоўваліся і багацелі калгасы, павышалася матэрыяльнае становішча беларускага народа, бурна развівалася яго культура, навука і мастацтва.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З велізарнай энергіяй працавала партыйная арганізацыя Беларусі над выкананнем рашэнняў XVIII з'езда партыі і рашэнняў ЦК ВКП(б).

КП(б)Б прарабіла сур'ёзнейшую работу па ўмацаванню сваіх радоў, па далейшаму ўздыму партыйна-палітычнай і арганізацыйнай работы. У складанейшых умовах гэтых год КП(б)Б загартавала свае рады, вырасціла выдатныя новыя кадры партыйных і совецкіх кіраўнікоў, да канца адданых справе нашай партыі.

Выбары на XVIII партыйны з'езд, прайшоўшыя канферэнцыі і сходы паказалі выключнае адзінства партыйных радоў, паказалі, што КП(б)Б, разграміўшы ворагаў народа і ачысціўшы ад перараджэнцаў партыйныя і совецкія арганізацыі, **прышла да свайго XVIII з'езда яшчэ больш адзінай, яшчэ больш маналітнай і згуртаванай вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна. (Апладысменты).**

Пяройдзем да разгляду работы, праробленай Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б і партарганізацыямі Беларусі за адчотны перыяд.

## I. Прамысловасць

У рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і поўнай перамогі генеральнай лініі нашай партыі, у рэзультаце ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, Беларусь

ператварылася з адсталай дробнасялянскай краіны, акраіны царскай Расіі ў мінулым, у перадавую індустрыяльна-калгасную совецкую соцыялістычную рэспубліку.

80 проц. усёй прадукцыі народнай гаспадаркі БССР прыпадае на долю прамысловасці. Удзельная вага прамысловай прадукцыі БССР у прадукцыі СССР вырасла з 0,82 у 1913 г. да 1,88 у 1939 г. БССР выпрабляе 33,8 проц. усёй вырабляемай у Саюзе фанеры, 27 проц. запалак, 30 проц. штучнай аліфы, 25 проц. дражджэй, 11 проц. маргарына, 10 проц. торфу. Па вырабу шарсцяных тканін БССР зараз займае другое месца ў Саюзе.

У БССР занава створаны такія галіны прамысловасці, як торфаздабываючая, лесараспрацоўкі, хімічная, будматэрыялаў, шкляная, металаапрацоўчая, дрэваапрацоўчая, запалкавая, тэкстыльная, швейная, скурмехавая і абутковая, харчасмакавая, у тым ліку мясная, маслаbooбча-малочная і кандзіцерская. Створаны такія галіны прамысловасці, якіх не ведала дарэвалюцыйная Беларусь. Да такіх галін прамысловасці адносяцца: вытворчасць штучнага шоўку, сельгасмашынабудаўніцтва, станкабудаўніцтва, вытворчасць матораў, турбін і т. д. Зараз у Беларусі ствараецца радыёпрамысловасць.

Якое вы ні возьмеце прадпрыемства ў Беларусі, яно або пабудавана, або карэнным чынам рэканструіравана ў годы совецкай улады. Амаль уся прадукцыя, выпушчаная ў 1939 г., выраблена на новапабудаваных або поўнасцю рэканструіраваных за годы совецкай улады прадпрыемствах.

За годы двух сталінскіх пяцігодак у БССР пабудавана і асвоена звыш 1.700 новых прадпрыемстваў. За годы двух сталінскіх пяцігодак у прамысловасць БССР укладзена звыш мільярда рублёў. За годы першай пяцігодкі сярэднегадовы тэмп прыросту прамысловай прадукцыі па БССР у 2 разы перавышаў сярэднегадовы тэмп росту па Саюзу.

Як расла наша прамысловасць, паказваюць наступныя лічбы (у млн. руб.).

| Годы | 1913 | 1932 | 1937 | 1938 | 1939 | 1939 у проц. да 1913 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Валавая прадукцыя . . | 99 | 980 | 1.926 | 2.113 | 2.295 | 2.320 |

З гэтай табліцы відаць, што валавая прадукцыя прамысловасці БССР вырасла ў параўнанні з 1913 г. у 23,2 раза.

З ростам нашай соцыялістычнай прамысловасці расце і рабочы клас Совецкай Беларусі.

На буйных прадпрыемствах і транспарце ў 1938 г. сярэднегадавая колькасць рабочых складала 330,5 тыс. чалавек супроць 13 тыс. чалавек у 1913 г.

Такавы пераканаўчыя вынікі перамогі генеральнай лініі нашай партыі, такі твар соцыялістычнай прамысловасці Беларускай ССР.

## Вынікі работы прамысловасці БССР за адчотны перыяд

У адчотны перыяд увесь народ Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі працаваў над ажыццяўленнем гістарычных рашэнняў XVIII з'езда партыі і задачы, пастаўленай таварышом

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сталіным,—«У найкарацейшы тэрмін дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах».

Прамысловасць рэспублікі выканала ў 1939 годзе дзяржаўны план па прамысловых наркаматах на 101,2 проц. За апошнія два годы прадукцыя ўсёй прамысловасці вырасла на 19,1 проц., дасягнуўшы аб'ёму ў 2.294,6 мільёна рублёў.

Вынікі работы прамысловасці за адчотны перыяд характарызуюцца наступнымі данымі (прадукцыя ў млн. рублёў):

| Галіны прамысловасці | 1938 г. | | 1939 г. | | Рост у проц. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Валавая прадукцыя | Проц. выканання гадавога плана | Валавая прадукцыя | Проц. выканання гадавога плана | 1938 г. да 1937 г. | 1939 г. да 1938 г. | 1939 г. да 1937 г. |
| Уся прамысловасць | 2115,2 | — | 2294,6 | — | 109,8 | 108,5 | 119,1 |
| Рэспубліканская . . | 915,4 | 100,2 | 999,8 | 102,1 | 112,9 | 109,2 | 123,8 |
| Промкааператыўн. (у цэнах 1932 г.) . | 547,1 | 94,2 | 690,1 | 107,0 | 108,8 | 126,1 | 137,4 |

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прадукцыя Наркамата паліўнай прамысловасці вырасла ў 1939 г. у параўнанні з 1938 г. на 37,9 проц., прадукцыя Наркаммясцпрома на 12,6 проц., прадукцыя промкааперацыі на 26,5 проц.

Цэлы рад наркаматаў (Наркамхарчпром, мяса-малочнай прамысловасці і інш.), галін прамысловасці (станкабудаўнічая) і многія прадпрыемствы датэрмінова выканалі гадавую вытворчую праграму 1939 года, даўшы дадаткова на мільёны рублёў прадукцыі звыш плана.

Работа прамысловых наркаматаў за 1938—1939 годы па асноўных паказальніках характарызуецца наступнымі данымі:

| Наркаматы і галіны | Проц. выканання плана (гадавога) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Годы | Валав. прадукцыі | Лік рабочых | Фонд зарплаты рабочых | Сярэдн. выпрац. рабочых | Сярэдн. зарплата рабочага |
| Усяго па рэспубліканскіх | 1938 | 100,2 | 86,4 | 103,9 | 103,9 | 107,0 |
| промнаркаматах | 1939 | 102,1 | 92,2 | 100,5 | 110,7 | 109,1 |

З гэтай табліцы відаць, што ў 1938 годзе, пры росце сярэдняй выпрацоўкі на аднаго рабочага па ўсёй прамысловасці рэспубліканскіх прамысловых наркаматаў на 3,9 проц., сярэдняя зарплата на 1 рабочага вырасла на 7 проц. Гэта прывяло да перарасходу больш 15 мільёнаў рублёў. Асабліва вялікі перарасход быў па Наркамлесу—14,3 проц.

У 1939 годзе ў цэлым па прамысловасці рэспубліканскіх прамысловых наркаматаў становішча змянілася к лепшаму. Сярэдняя

выпрацоўка на аднаго рабочага павялічылася на 10,7 проц. пры росце сярэдняй зарплаты на аднаго рабочага на 9,1 проц.

Неабходна адзначыць, што аб'ём вытворчай прадукцыі павялічыўся, галоўным чынам, дзякуючы росту прадукцыйнасці працы. Выпрацоўка на аднаго рабочага ў 1939 годзе складала 11.178 руб. супроць 9.296 рублёў у 1937 годзе.

У 1938 годзе рост прадукцыйнасці працы складаў к папярэдняму году 10,1 проц., а ў 1939 годзе—13,3 проц. У 1939 годзе прадукцыйнасць працы ў параўнанні з 1937 годам вырасла на 25,3 проц.

У 1934 годзе прырост прадукцыі пакрываўся на 87,4 проц. за лік росту колькаснасці рабочых і толькі на 12,6 проц. за лік росту прадукцыйнасці працы. У перыяд-жа з 1934 г. па 1937 год уключна ўвесь прырост прадукцыі пакрываўся на 77,5 проц. за лік росту прадукцыйнасці і на 22,5 проц. за лік росту колькаснасці рабочых. За апошнія два годы прырост прадукцыі, які складаў 19,1 проц., поўнасцю пакрываўся за лік росту прадукцыйнасці працы.

Выкананне дзяржаўных планаў і якаснае паляпшэнне работы прамысловасці забяспечана ў рэзультаце далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, умацавання працоўнай дысцыпліны, разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху. Соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, многастаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій, народны рух за выкананне пяцігодкі па прадукцыйнасці працы ў 4 годы з'явіліся магутнымі рычагамі ў справе паляпшэння ўсёй работы прамысловасці. Выраслі выдатныя кадры рабочых вытворчасці, стаханаўцаў, паказваючых узоры выканання вытворчых планаў і павышэння прадукцыйнасці працы.

У такіх галінах прамысловасці, як Наркамлегпром, Наркаммясцпром, Наркамхарчпром, больш палавіны ўсіх рабочых з'яўляюцца стаханаўцамі.

На прадпрыемствах Наркаммясцпрома 35,3 проц. усіх здзельшчыкаў выконваюць нормы выпрацоўкі звыш 150 проц. і 27,8 проц.—ад 120 да 150 проц. Сотні і тысячы стаханаўцаў паказваюць выдатныя ўзоры соцыялістычнай працы. Токар Магілеўскага завода імені Дзімітрава тав. Лапаткін і фармаўшчык тав. Краўцоў на працягу ўсяго года сістэматычна выконвалі дзве—дзве з палавінай нормы. Слесар Мінскага завода «Ударнік» тав. Загарулька выконвае нормы на 200 проц.

Стаханаўцы Бабруйскага завода імені Сталіна фармаўшчык тав. Сверж, каваль тав. Шэйко, токар тав. Печарэнка выконваюць свае нормы звыш 200 проц.

Шырыцца рух многастаночнікаў.

На гомельскай чулочнай фабрыцы імені 8 сакавіка стаханаўка тав. Дзіслякова раней абслугоўвала 4 трыкатажныя машыны, зараз працуе на 6-ці машынах, выконвае нормы звыш 115 проц.

На Мінскім заводзе імені Чкалава рабочы-вальцоўшчык тав. Юдзенка перайшоў на абслугоўванне двух вальцовачных станкоў, выконвае нормы на 350 проц. На гэтым-жа заводзе рабочы тав. Кандрацьеў на працэсе загартоўкі і цэментацыі ланцугоў перайшоў на абслугоўванне трох пячэй і выконвае нормы на 270 проц.

Імкненне рабочых да пераходу на многастаночную работу вельмі вялікае, і там, дзе яно сустракае падтрыманне і дапамогу,—рух многастаночнікаў расце.

Гэты рух трэба падтрымліваць і развіваць далей.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Мясцовая прамысловасць

За справаздачны перыяд ёсць некаторае паляпшэнне ў рабоце мясцовай прамысловасці і промкааперацыі. Аб'ём валавой прадукцыі мясцовай прамысловасці павялічыўся на 31,4 проц. Значна расшыран асартымент і палепшана якасць выпускаемай прадукцыі.

За перыяд пасля XVIII з'езда ВКП(б) арганізавана 659 майстэрань па рамонту швейных і скурабутковых вырабаў, металавырабаў, мэблі і абоза. Адкрыта больш 352 новых арцелей, невялікіх прадпрыемстваў і цэхаў. Аднак, трэба прызнаць гэта зусім недастатковым.

Мясцовая прамысловасць і прамысловая кааперацыя належаць да ліку галін народнай гаспадаркі, уладаючых невычарпальнымі магчымасцямі развіцця.

Беларусь багата прыроднымі і сыравіннымі рэсурсамі—лесам, рэкамі, азёрамі, торфам, высокаякаснай глінай, крэйдай, вапнякамі, балотнай рудой і т. д. Беларускія сады і лясы багаты пладамі, дзікарастучымі ягадамі і грыбамі. Ёсць многа адыходаў лясной, металаапрацоўчай, швейнай, скуранай, абутковай, тэкстыльнай, ільноапрацоўчай, малочнай і іншых галін прамысловасці, якія даюць поўную магчымасць у кожным раёне рэспублікі выпрацоўваць вырабы шырокага спажывання.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аднак, трэба з усёй вастратой адзначыць, што раённая і абласная мясцовая прамысловасць і промкааперацыя ўсё яшчэ працуюць нездавальняюча і слаба развіваюцца, у асаблівасці ў сельскіх мясцовасцях. Увесь аб'ём прадукцыі раённай і абласной мясцовай прамысловасці па плану 1939 года складае толькі 49,9 млн. рублёў (у цэнах 1926—27 гг.). Гэта вельмі мала ў параўнанні з тым, колькі мы можам выпускаць.

З 87 прадпрыемстваў абласнога і раённага падпарадкавання Наркаммясцпрома толькі 24 прадпрыемствы вырабляюць прадметы шырокага спажывання.

Удзельная вага тавараў шырокага спажывання ва ўсёй прадукцыі мясцовай прамысловасці складае толькі 43 проц.

Да 1940 года ў Беларусь, маючую дастаткова сыравіны для дрэваапрацоўкі, штогод завозілася 2 мільёны драўляных лыжак з Горкаўскага края, начоўкі, 5 млн. зажымаў для бялізны з Одэсы, 30 тысяч дуг, 20 тысяч кошыкаў базарных з лазы, дзіцячыя цацкі і т. д. З раёна ў раён перавозяцца безалкагольныя напіткі, марожанае, кандзіцерскія вырабы, мэбля, торф, будматэрыялы і іншыя прадметы спажывання. Да гэтага часу ў нас не выпрацоўваецца крэм для абутку. Люстры буйныя вывозяцца з Беларусі, а дробныя завозяцца, у нас не выпрацоўваюцца чарнільныя прылады, шахматы, драўляныя лінейкі і вугольнікі, усё гэта завозіцца. У Беларусь завозяцца ўсе віды кансерваў, у той час, як мы маем усе магчымасці выпрацоўваць кансервы мяса-раслінныя, свіна-бабовыя, праводзіць кансерваванне агуркоў, памідораў, шпіната, фруктаў і т. д.

Некаторыя работнікі мясцовай прамысловасці і промкааперацыі, ды і некаторыя партыйныя і савецкія работнікі мараць аб будаўніцтве буйных прадпрыемстваў, аб вялікіх капіталаўкладаннях, упускаючы зусім з-пад увагі невялікія прадпрыемствы, цэхі, майстэрні, закліканыя абслугоўваць штодзённыя патрэбы працоўных, якія лёгка можна арганізаваць у кожным раёне. Гэтыя таварышы лічаць за леп-

шае атрымаць бялізную прышчэпку з Одэсы, у той час, як мы можам вырабам іх з адыходаў нашых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў забяспечыць патрэонасці ўсяго Саюза.

У нас не толькі ў гарадах, але і ў сёлах, у калгасах распаўсюджана многа веласіпедаў, матацыклаў, ручных і насценных гадзіннікаў, электраўцюгоў, прымусаў, патэфонаў, радыёпрыёмнікаў, швейных машын і т. д., а рамантаваць у выпадку псавання якую-небудзь з гэтых рэчаў можна толькі ў абласным горадзе, ды і то не ў кожным.

Мы павінны дабіцца арганізацыі металарамонтных майстэрань у кожным раёне рэспублікі.

У Беларусі велізарная колькасць глін, з якіх можна рабіць цэглу, чарапіцу. Аднак, дахі на дамах у сельскіх мясцовасцях саламяныя і драўляныя.

Велізарная колькасць калгасаў, якія адлічваюць буйныя сродкі на будаўніцтва доўгачасовых пабудоў грамадскага значэння, не будуюць нічога з цэглы.

Усё гэта адбываецца таму, што да гэтага часу існавалі дзікія пагардлівыя адносіны да развіцця мясцовай цагельнай і чарапічнай прамысловасці, так неабходнай для будаўніцтва ў калгасах і раённых цэнтрах.

У рэспубліцы амаль знік ганчарны промысел. Ці-ж у нас няма гліны і торфу для абжыгу? Ці-ж не існуюць ужо ганчары? Ці-ж не існуе патрабаванне і ў такіх рэчах, як жбан для малака або гліняны гаршок, іх возьме кожная калгасніца. Ёсць у нас некалькі арцелей, якія займаюцца выпускам вырабаў з гліны. Але гаршкі яны робяць так дрэнна, што па колеры відаць, што хутка разваляцца, і сапраўды развальваюцца. А раней рабілі гаршкі, у якіх у вёсцы страву гатавалі, прычым за гаршком не трэба было ехаць за 50 кілометраў, а іх вазамі развозілі па вёсках. Трэба гэты промысел аднавіць. Справа гэта патрэбная, і для развіцця яе ёсць усе магчымасці.

Неабходна рацыянальна і правільна размясціць дрэваапрацоўчую прамысловасць, забяспечыць наяўнасць у кожным раёне сталярнай майстэрні па выпрацоўцы школьнай і хатняй мэблі, па выкананню заказаў на буддэталі для патрэб мясцовага будаўніцтва.

Неабходна наладзіць вытворчасць шырокага асартымента бандарных і шчэпных вырабаў, расшырыць сетку майстэрань па абозабудаўніцтву.

Трэба арганізаваць у кожным раёне вытворчасць безалкагольных напіткаў, перапрацоўку ягад, грыбоў, гародніны і іншых харчовых прадуктаў.

Промкааперацыя павінна расшырыць асартымент і павялічыць аб'ём вытворчасці прадукцыі шырспажыва (галоўным чынам у сельскіх мясцовасцях і раённых цэнтрах) не менш чым у паўтара раза, а па мясцовай абласной і раённай прамысловасці—у два разы.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) таварыш Молатаў сказаў: «Задача заключаецца ў тым, каб усямерна расшырыць вытворчасць тавараў шырокага спажывання, развіваючы ўсе галіны лёгкай, харчовай і мясцовай прамысловасці. Максімальны ўдзел у гэтай рабоце мясцовых партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый ва многім павінен паскорыць уздым вытворчасці тавараў шырокага спажывання».

Справа развіцця мясцовай прамысловасці—гэта наша родная, бальшэвіцкая справа. Няма больш пачотнай для бальшэвікоў задачы, чым нястомныя клопаты аб задаволенні патрэб і запросаў працоўных. 1940 год павінен быць годам рашучага павароту да ўздыму мясцовай прамысловасці і промкааперацыі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Паліўная прамысловасць

У рабоце паліўнай прамысловасці ёсць значныя поспехі. Аб'ём торфаздабычы за два годы павялічыўся з 2 522,6 тыс. тон у 1937 г. да 3 160,0 тыс. тон у 1939 г., або на 25,2 проц.

Тарфяная прамысловасць Беларусі ператварылася ў адну з вядучых галін прамысловасці. Удзельная вага торфу ў паліўным балансе рэспублікі з года ў год узрастае, пры адпаведным змяншэнні ўдзельнай вагі дальнепрывознага паліва.

Вось табліца, характарызуючая ўдзельную вагу торфу ў паліўным балансе.

| Найменаванне паліва | Увесь паліўны баланс | | У тым ліку пром. | |
|---|---|---|---|---|
| | 1937 г. | 1939 г. | 1937 г. | 1939 г. |
| Усяго . . . . | 100% | 100% | 100% | 100% |
| У тым ліку: | | | | |
| торф . . . . | 44,3 | 55,0 | 53,3 | 67,5 |
| дамецкі вугаль . . | 13,1 | 9,2 | 11,7 | 8,9 |

Як бачыце, з года ў год расце спажыванне торфу і змяншаецца спажыванне прывознага паліва.

За годы другой сталінскай пяцігодкі асноўныя фонды тарфяной прамысловасці Беларусі ўзраслі ў 3,6 раза і на аснове гэтага рэзка павялічылася механізаваная здабыча торфу.

Зараз паліўная прамысловасць БССР павінна фарсіравана рыхтаваць новабудоўлі для ўводу ў эксплаатацыю, каб забяспечыць у бліжэйшыя годы максімальнае развіццё тарфяной прамысловасці ў поўнай адпаведнасці з патрэбамі народнай гаспадаркі ў мясцовым паліве.

Мы павінны дабіцца ў бліжэйшыя годы пераводу ўсёй прамысловасці, комунальных і бытавых прадпрыемстваў і будынкаў на тарфяное паліва.

Работнікі паліўнай прамысловасці павінны таксама забяспечыць унядрэнне новых, больш дасканалых спосабаў здабычы, комплекснай механізацыі здабычы, сушкі, уборкі і вывазкі торфу.

Саюзны ўрад аддае велізарную ўвагу развіццю мясцовых відаў паліва. Сесія Вярхоўнага Совета Саюза ССР задаволіла нашу просьбу аб павелічэнні асігнаванняў на павелічэнне торфаздабычы на 10 млн. рублёў.

Абавязак Наркампаліва і мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый—поўнасцю і найбольш рацыянальна скарыстаць дзяржаўныя асігнаванні на развіццё мясцовай паліўнай базы. Соўнаркому Беларусі трэба глыбей заняцца гэтым пытаннем.

Неабходна падняць значэнне Наркамата паліўнай прамысловасці, стварыць яму неабходныя ўмовы, укамплектаваць кадрамі і павысіць патрабаванні да яго, як да наркамата, які нясе велізарную адказнасць за стан паліўнай базы рэспублікі.

Перад намі стаіць таксама задача развіцця мясцовай здабычы

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

торфу ў раёнах, калгасах для патрэбнасцей бытавых і прадпрыемстваў раённага і абласнога значэння. У бліжэйшыя два годы трэба дабіцца спынення варварскага знішчэння лясных масіваў на дровы і перайсці на апальванне торфам. БССР мае выключна багатыя рэсурсы торфу. Да развіцця гэтай важнейшай галіны народнай гаспадаркі павінна быць прыкавана ўвага ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый.

## Лясная прамысловасць

За прайшоўшы перыяд ёсць рад паляпшэнняў у рабоце лясной прамысловасці БССР.

У 1939 годзе лесазагатоўчая прамысловасць Наркамлеса ўпершыню за апошнія годы выканала ўстаноўлены дзяржаўны план на 101 проц. і дала рост у параўнанні з 1938 г. па вагатоўцы на 18,4 проц., вывазцы—16,4 проц.

Дрэваапрацоўчая прамысловасць (фанера, мэбля, лесапіленне, дрэваапрацоўка) план 1939 г. выканала на 100,3 проц. і дала прырост прадукцыі супроць 1938 г. на 4.384 тысячы рублёў.

План росту прадукцыйнасці працы па ўсёй прамысловасці Наркамлеса за 1939 г. выканан на 103,9 проц.

Пры гэтым фабрычна-заводская прамысловасць дала рост прадукцыйнасці працы ў параўнанні з 1938 г. на 13,9 проц.

У лясной прамысловасці шырока разгарнуўся стаханаўскі рух на лесазагатоўках і лесавывазцы.

Звеннявая сістэма загатоўкі лесу па метаду знатнага лесаруба т. Гоціна Васілія Антонавіча, брыгадная вывазка па метаду тт. Слухоўскага, Ганчарэнка атрымалі шырокае распаўсюджанне ў лясной прамысловасці Беларусі.

Імёны лесаруба Гоціна, сплаўшчыка Туфата, возчыкаў Ганчарэнка, Слухоўскага, як наватараў лясной прамысловасці, вядомы далёка за межамі БССР.

Аднак, лясная прамысловасць БССР мае яшчэ рад буйнейшых недахопаў.

Запалкавая прамысловасць БССР у 1939 г. хоць і павялічыла выпуск запалак у параўнанні з 1937 г. на 44,9 проц., аднак, устаноўлены план 1939 г. выканан толькі на 93,2 проц.

Яшчэ недастатковая ўдзельная вага вывазкі лесу ўласным транспартам. У 1939 г. ім было вывезена ўсяго 45 проц. агульнага плана.

Вельмі марудна ўнядраецца механізацыя на пагрузачна-разгрузачных работах.

Для рашучага паляпшэння работы лясной прамысловасці неабходна правільнае размяшчэнне лесазагатоўчай і дрэваапрацоўчай прамысловасці—неабходна ў бягучым годзе замацаваць лесафонд для кожнага леспрамгаса і мехлеспункта не менш, чым на 5 год.

Трэба на працягу 1940 і 1941 гг. давесці аб'ём вывазкі лесу ўласным транспартам па ўсходніх абласцях да 80 проц., а па заходніх—да 40 проц., стварыўшы пастаянную кармовую базу для гужавога транспарта.

Рашуча пакончыць з адставаннем запалкавай прамысловасці. Ліквідаваць недапушчальныя страты сыравіны на фабрыках, палепшыць якасць выпускаемых запалак.

Неабходна ўзмацніць кіраўніцтва работай леспрамгасаў, дабіцца найбольш эфектыўнай эксплаатацыі механізмаў, правільнай арганізацыі правядзення работ і замацавання неабходных кадраў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Электрыфікацыя

Магутнасць электрастанцый Беларусі складае каля 102 тыс. квт., што ў 20 разоў перавышае ўстаноўленую магутнасць электрастанцый у 1913 годзе.

За адчотны перыяд уведзена дадатковая магутнасць у 12 тыс. квт. на Белдрэсе, пабудавана і ўступіла ў эксплаатацыю першая чарга Мозырскай электрастанцыі на 500 квт.

Уведзена ў эксплаатацыю 15 дробных гідрастанцый. Усяго па БССР налічваецца 29 гідрастанцый. У гэтым годзе пачынаецца будаўніцтва Лукомльскай гідрастанцыі магутнасцю ў 520 квт., якая будзе абслугоўваць 45 калгасаў.

Не гледзячы на некаторыя зрухі ў галіне электрыфікацыі, гэта галіна гаспадаркі яшчэ значна адстае ад узроўню развіцця ўсёй народнай гаспадаркі рэспублікі.

З уводам у эксплаатацыю другой чаргі Белдрэса ўмацоўваецца энергабаза паўночнага энергавузла, але ў той-жа час адчуваецца вельмі рэзкі недахоп электраэнергіі па Гомелю і Мінску. К канцу 1939 года недахоп устаноўленай магутнасці складаў па Мінску 9.000 квт. і па Гомелю 5.000 квт.

Недастатковая магутнасць электрастанцый яшчэ моцна паглыбляецца дрэннай работай самых электрастанцый, якія працуюць з няпоўнай нагрузкай, маюць многа аварый і адключэнняў спажыўцоў электраэнергіі, у выніку чаго прамысловасць недаатрымала 496.308 квт. гадз. электраэнергіі. Адзін Белдрэс недадаў па плану 1939 г. 9.650 тыс. квт. гадз.

Дрэнная работа электрастанцый вельмі адбілася на рабоце прамысловасці ў першым квартале 1940 года, асабліва па Віцебску, Мінску, Магілеву. На электрастанцыях не вядзецца дастатковай барацьбы за эканомнае расходванне электраэнергіі на ўласныя патрэбы. Няма барацьбы з перапалам паліва. Перапал паліва на Белдрэсе павялічыўся з 1.837 тон умоўнага паліва ў 1937 г. да 5.933 тон у 1939 годзе. Трэба рашуча пакончыць з такой дрэннай работай электрастанцый. Партыйныя арганізацыі павінны ўзяць работу электрастанцый пад свой штодзённы і жорсткі кантроль.

У студзені 1940 года Цэнтральным Камітэтам КП(б) Беларусі вынесена рашэнне «Аб стане электраснабжэння Беларускай ССР», у якім падкрэслівалася адставанне энергетычнай базы БССР ад патрэбнасцей растучай народнай гаспадаркі, слабае развіццё гідрабудаўніцтва і астрата, якая стварылася ў электраснабжэнні гарадоў Мінска, Віцебска, Гомеля, Бабруйска і інш.

Пасля гэтага рашэння Народным Камісарыятам электрастанцый праведзена даследванне пытання аб далейшым развіцці энергетыкі ў Беларускай ССР. Планавае заданне Наркамата электрастанцый Саюза ССР прадугледжвае будаўніцтва паўднёвай ДзЭС на базе Васілевіцкага торфамасіва і ДзЭС на базе Смалявіцкага торфамасіва. Планавае заданне таксама прадугледжвае будаўніцтва двух ЦЭЦ—у Віцебску і Магілеве па 6.000 кіловат і расшырэнне Бабруйскай электрастанцыі. У прыватнасці, зараз ёсць указанне Наркамата электрастанцый Саюза ССР аб выбары пляцоўкі для Васілевіцкай электрастанцыі.

Ажыццяўленне гэтых мерапрыемстваў з'яўляецца важнейшай задачай у справе развіцця энергетыкі БССР на бліжэйшыя некалькі год.

Трэба ўсямерна развіваць дробнае гідрабудаўніцтва, у асаблівасці для патрэб калгаснай сельскай гаспадаркі. Неабходна не пазней IV кв. 1940 г. увесці ў эксплаатацыю 2-ю чаргу Мінскай ГЭС № 2.

Выконваючы планы трэцяй сталінскай пяцігодкі, трэба дабіцца такога становішча, каб дабыча торфу і развіццё энергетычнай базы былі дастатковымі для задавальнення патрэбнасцей народнай гаспадаркі.

## Жыллёва-комунальная гаспадарка

У адчотны перыяд значна палепшыўся стан жыллёва-комунальнай гаспадаркі. У гэту галіну былі накіраваны значныя капіталаўкладанні.

За 1938 і 1939 гг. уведзена ў дзеянне не менш 118 тыс. кв. метраў жылплошчы.

Значна расшыраны і рэканструіраваны гарадскія водаправоды, у асаблівасці ў Мінску і Магілеве. У Мінску пабудавана новая водаправодная станцыя з магутным водазборам. За 1939 год водаправодная сець узрасла на 17 кілометраў.

Пабудаваны лазне-пральныя камбінаты і лазні ў Полацку, Мозыры, Мінску, Магілеве, Нова-Беліцы, Рэчыцы, Слуцку і іншых раённых цэнтрах.

Зроблена перашыўка на шырокую каляю трамвая ў г. Віцебску з поўнай рэканструкцыяй трамвайнага парка і заменай рухомага састава.

Значныя работы ўтрачаны па агульнаму дабрабыту гарадоў і раённых цэнтраў БССР (забрукаванне, азеляненне, ачыстка, будаўніцтва мастоў, артэзіянскіх скважын і т. д.).

У рэзультаце работ па будаўніцтву і рэканструкцыі аб'ектаў комунальнай гаспадаркі абслугоўванне насельніцтва гарадоў палепшылася.

Аднак, жыллёва-комунальная гаспадарка гарадоў БССР, не гледзячы на вялікі рост, усё яшчэ адстае ў сваім развіцці і не можа быць прызнана поўнасцю адказваючай узроўню тых патрабаванняў, якія прад'яўляе да яе насельніцтва гарадоў і раённых цэнтраў у сувязі з бурным ростам культуры і дабрабыту працоўных.

У 1931 годзе на ленінградскім партыйным актыве Сергей Міронавіч Кіраў гаварыў:

> «... Што такое комунальная гаспадарка? Гэта, у канечным рахунку, той участак нашай совецкай гаспадаркі, дзе нашы рабочыя праводзяць калі не большую частку свайго часу, то ва ўсякім выпадку палавіну, 7—8 гадзін рабочы працуе на заводзе, а астатні час ён праводзіць у сваім жыллі, на вуліцы, у садзе, у тэатры, дзе хочаце, г. зн. праводзіць у комунальнай гаспадарцы ў шырокім сэнсе гэтага слова».
>
> «... ці можам мы зрабіць больш таго, што мы зрабілі для нашай комунальнай гаспадаркі, выходзячы з рознага роду мясцовых рэсурсаў? Павінен сказаць прама: можна. Не зрабілі толькі таму, што на комунальную гаспадарку, на вялікі жаль, глядзелі скрозь пальцы».

Гэтыя словы Сяргея Міронавіча Кірава цалкам і поўнасцю адносяцца да комунальнай гаспадаркі Беларусі. І ў нас на яе глядзелі скрозь пальцы, і яна церпіць таму многія недахопы, якія магчыма ўстраніць мясцовымі сіламі, мясцовымі рэсурсамі, без усякіх асаблівых капіталаўкладанняў.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

У нашых абласных гарадах і нават у сталіцы—у Мінску ёсць яшчэ неўпарадкаваныя вуліцы, прывесці ў парадак якія не прадстаўляе асаблівай працы. У парках, садах, скверах зелень развіта недастаткова, мала кветак, летам пыл, кіоскі з прахладжальнымі напіткамі, з марожаным сустрэнеш рэдка і зроблены яны груба, не пафарбаваны. Аўтамабілі па вуліцах ў радзе выпадкаў ходзяць нямытыя, аўтобусы абдрапаныя, трамваі не пафарбаваныя.

Горвыканкомы—гаспадары гарадоў—і комунальныя органы павінны аб'явіць рашучую барацьбу за падняцце культурнага выгляду нашых гарадоў і іх санітарнага становішча.

Жыллё мае велізарнае значэнне. З кожным годам уводзяцца сотні тысяч метраў жылой плошчы. Аднак, у радзе выпадкаў адносіны да гэтай дзяржаўнай маемасці—да жылля—драпежніцкія, яна выводзіцца са строю ў велізарных недапусцімых размерах. Адбываецца гэта з-за таго, што органы комунальнай гаспадаркі не сочаць за эксплаатацыяй. У дамах колюць дровы, дамы затапляюцца вадой, зімой недастаткова ацяпляюцца, лопаюцца трубы, дахі несвоечасова чыняць, таму працякае вада, адвальваецца штукатурка і т. д. і т. п. Рамонт робіцца дрэнна.

Пастанова ўрада аб матэрыяльнай адказнасці жыхароў за становішча займаемага імі жылога фонду павінна стаць магутным рычагом яго захавання.

Партыйныя арганізацыі і савецкія органы гарадоў, раённых цэнтраў і рабочых пасёлкаў павінны рашуча па-большэвіцку ўзяцца за вырашэнне пытанняў, звязаных з паляпшэннем комунальнага абслугоўвання насельніцтва.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Капітальнае будаўніцтва

У народную гаспадарку БССР штогод накіроўваюцца вялікія сумы капіталаўкладанняў. У 1937 годзе аб'ём выкананых капітальных укладанняў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі склаў 380,0 млн. рублёў, у 1938 годзе капіталаўкладанні дасягнулі 408,0 мільёнаў рублёў, у 1939 годзе—403 млн. руб., а на 1940 год прадугледжана ўкласці 670,0 млн. руб.

Народная гаспадарка рэспублікі абагацілася новымі прадпрыемствамі, жыллёвымі будынкамі, школамі, бальніцамі, тэатрамі і т. д.

За адчотны перыяд рэканструіраваны і нанава пабудаваны буйнейшыя прадпрыемствы, як шклозавод «Октябрь», іголкавы завод у Віцебску, лістапракатны цэх, цэх сухой фармоўкі цэглы, косцеапрацоўваючы завод і хлебазавод у Магілеве, масласыраробчы завод у Слуцку, кансервны завод згушчонага малака ў Рагачове, электрастанцыя ў Мозыры, устаноўлена турбіна ў 12 тыс. квт. на Белдрэсе. На 1940 год намечаны да ўводу ў эксплаатацыю Мінскі хлебазавод, радыёзавод, кіностудыя, рад жылых дамоў, кінотэатраў і другіх аб'ектаў.

Зусім нецярпімым, патрабуючым суровага асуджэння, з'яўляецца факт сістэматычнага зрыву планаў капітальнага будаўніцтва. За 1938 і 1939 годы план лімітных капіталаўкладанняў недавыканан на 75,0 млн. рублёў.

Недаасваенне капіталаўкладанняў прыводзіць да вялікай колькасці няскончаных пераходзячых аб'ектаў, а гэта значыць—да амяртвення сродкаў. Аб гэтым красамоўна гавораць наступныя факты. Звыш

3-х год будуецца цэх сухой фармоўкі цэглы ў Магілеве агульнай каштоўнасцю ў 2,5 млн. рублёў і ў 1940 годзе яшчэ трэба асвоіць каля 600,0 тыс. рублёў. Дашкольнае вучылішча ў Крычаве агульнай каштоўнасцю ў 1,2 млн. рублёў будуецца з 1937 года і на 1 студзеня 1940 г. укладанні склалі толькі 700,0 тыс. руб. Няўжо-ж Крычаўскі раён не мае патрэбы ў вучылішчы і калі-ж гэты аб'ект будзе закончан і ва што ён абыйдзецца дзяржаве, калі ён у далейшым будзе будавацца такімі тэмпамі?

Дом соцкультуры ў Слуцку каштоўнасцю ў 500,0 тыс. руб., які мог-бы з поспехам быць закончан у адзін год, будуецца з 1937 года, і за ўвесь час па гэтаму аб'екту асвоена толькі 97,0 тыс. руб., не гледзячы на тое, што штогод гэты аб'ект поўнасцю забяспечваўся сродкамі. Дзяржплан унёс прапанову аб зняцці асігнаванняў і спыненні будаўніцтва. ЦК адхіліў прапанову Дзяржплана, бо нельга, каб насельніцтва было пазбаўлена неабходнага будынка з-за бесклапотнасці кіраўнікоў раёна.

У чым прычыны такога адставання будаўніцтва?

Многія нашы гаспадарнікі наркаматаў і ведамстваў, раённыя партыйныя і совецкія работнікі актыўна вядуць сябе, дабіваючыся асігнавання сродкаў, а атрымаўшы сродкі, лічаць задачу вычарпанай і перадавяраюць кіраўніцтва будаўніцтвам другарадным асобам, зачастую няздольным пераадолець цяжкасці, якія ўзнікаюць у працэсе будаўніцтва.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У Беларускім трэсце прамысловага будаўніцтва, у 5 абласных будаўнічых трэстах і ў такіх бударганізацыях, як Белэнергабуд, торфабуд, яўна нядобра абстаіць справа з замацаваннем кадраў, з дысцыплінай на будаўніцтве, з арганізацыяй работ на будаўнічых пляцоўках, з выкарыстаннем механізмаў. На саміх будоўлях не вядзецца сістэматычнай барацьбы за беражлівае, эканомнае расходванне гэтых вострадэфіцытных матэрыялаў. З усімі гэтымі ненармальнасцямі трэба пакончыць. Трэба карэнным чынам палепшыць работу нашых будаўнічых арганізацый, каб у 1940 годзе поўнасцю справіцца з будаўнічай праграмай.

Поспех будаўнічай справы ў значнай меры залежыць ад прамысловасці будматэрыялаў. Адставанне ў развіцці гэтай прамысловасці прыводзіць да таго, што самыя простыя мясцовыя будматэрыялы, як цэгла і вапна, лімітыруюць у радзе выпадкаў нашы будоўлі, асабліва ў першым паўгоддзі, г. зн. калі яны больш за ўсё патрэбны на будоўлях. А гэта аб'ясняецца тым, што прамысловасць будматэрыялаў у недастатковай меры ўнядрае круглагадовы метад вытворчасці і не ствярае патрэбных пераходзячых запасаў, забяспечваючых бесперабойнасць нашага будаўніцтва.

Не праяўляецца ініцыятыва ў справе адшукання новых відаў будматэрыялаў у вытворчасці замяніцеляў вострадэфіцытных фандыруемых будматэрыялаў.

Будаўнічая прамысловасць яшчэ не прыстасавалася да вытворчасці абліцовачнай, пустацелай і фасоннай цэглы, якая ў значнай меры замяніла-б вострадэфіцытныя аддзелачныя матэрыялы. Амаль нічога не прадпрынята ў галіне шырокага прымянення вытворчасці гатовых канструкцый для будаўніцтва (штукатурныя пліты, гатовыя перакрыцці і інш.).

Нярудныя выкапні, як бутавы камень, гравій і інш., завозяцца на далёкія адлегласці з-за межаў БССР, залішне загружаюць транспарт

і падаражаюць будаўніцтва, у той час як у БССР ёсць поўная магчымасць арганізаваць іх прамысловую распрацоўку.

Гэта таксама адносіцца да вытворчасці вапны, 70 проц. усёй вытворчасці якой сканцэнтрыравана ў адным толькі пункце—Віцебску.

Неабходна рашуча палепшыць работу прамысловасці будматэрыялаў, усямерна развіваючы мясцовую вытворчасць будматэрыялаў.

## Чыгуначны транспарт

За адчотны перыяд ёсць паляпшэнні ў рабоце чыгуначнага транспарта. Беларуская і Заходняя чыгункі па асноўных колькасных паказальніках план перавыканалі. Беларуская чыгунка па сярэднесутачнай пагрузцы план выканала ў 1939 г. на 113 проц., па сярэднесутачнай выгрузцы—на 126 проц. Заходняя чыгунка—адпаведна на 123 проц. і 105 проц.

У дні вызвалення Заходняй Беларусі чыгункі працавалі асабліва напружана і нядрэнна справіліся з пастаўленымі перад імі задачамі.

Значна горш абстаіць з выкананнем якасных паказальнікаў. Пры выкананні плана пагрузкі ў цэлым не выканан план пагрузкі па раду рашаючых грузаў. Так, напрыклад, Беларуская чыгунка не падала пад грузы дзяржаўнага плана 12.396 вагонаў, за што заплаціла 1 мільён рублёў штрафаў.

Абедзве чыгункі не выканалі асноўнага якаснага паказальніка па абароту вагонаў. На Беларускай чыгунцы ў 1939 годзе абарот вагонаў склаў 1,81 сутак пры заданні 1,4 сутак, на Заходняй—1,45 сутак пры заданні 1,2 сутак.

Асноўнай прычынай замаруджанага абароту вагонаў з'яўляюцца вялікія прастоі пад пагрузкай і выгрузкай. Немалая віна ляжыць і на кліентуры. Толькі па Беларускай чыгунцы кліентура заплаціла ў 1939 годзе за затрымку вагонаў 1.822 тыс. руб.

Чыгуначнікі дрэнна змагаюцца з крушэннямі, аварыямі і бракам. Па Беларускай чыгунцы 1939 год у параўнанні з 1938 годам даў павелічэнне ліку крушэнняў. Гэта з'яўляецца прамым вынікам недастатковай працоўнай дысцыпліны.

Чыгункі дрэнна падрыхтаваліся да зімы 1939—1940 года. Гэта прывяло да рэзкага пагоршання работы чыгунак у 1 квартале 1940 года. Нельга дапусціць, каб гэтыя сур'ёзныя недахопы паўтараліся і надалей.

Асноўнай рашаючай задачай чыгуначнікаў з'яўляецца ўмацаванне дысцыпліны, як адной з важнейшых умоў паляпшэння ўсёй работы чыгуначнага транспарта.

## Водная гаспадарка і водны транспарт

Беларусь мае каля 30 тыс. кіламетраў водных шляхоў. Такія рэкі, як Днепр, Бярэзіна, Прыпяць, Сож, Заходняя Дзвіна, Нёман і інш., не гаворачы аб радзе дробных рэк сумарнай працягласцю звыш 20 тыс. кіламетраў, адыгрываюць вялікую ролю ў ажыццяўленні міжраённых сувязей.

Водная гаспадарка ў БССР пачынае займаць значнае месца ў народнай гаспадарцы рэспублікі.

За 1939 год Днепра-Дзвінскім параходствам перавезена грузаў на 43,8 проц. больш чым у 1937 годзе.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Тым не менш аб'ём работы воднага транспарта яшчэ далёка не задавальняе патрэб і запросаў гаспадаркі. Для міжраённых сувязей невялікія рэкі выкарыстоўваюцца мала. Усё гэта прыводзіць да таго, што чыгуначны транспарт залішне загружаецца.

У 1939 годзе з 115 тысяч тон солі, завезенай у БССР, водным транспартам было завезена толькі 49 тыс. тон замест магчымых да завозу 85 тыс. тон.

Фасфарытная мука Крычаўскага фасфарытнага завода вывозіцца водным транспартам толькі ў колькасці 5 тыс. тон, у той час, як патрэбнасць прыводных раёнаў у фасфарытнай муцэ складае звыш 50 тыс. тон.

Вапна, сканцэнтраваная ў Віцебску на беразе Заходняй Дзвіны перавозіцца чыгуначным транспартам.

Паступаючы з поўдня камень мог-бы быць поўнасцю завезен у раёны, прылягаючыя да Прыпяці, выключна водным транспартам, а між тым ён перавозіцца чыгункай і т. д.

У сучасны момант, у рэзультаце прынятых партыяй і ўрадам мер, наша рэспубліка абагачаецца новымі транспартнымі воднымі шляхамі, якія паляпшаюць не толькі ўнутрырэспубліканскія сувязі, але і маюць саюзнае значэнне, як Днепра-Бугскі і Огінскі каналы.

Неабходна, каб нашы партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі дабіліся максімальнага выкарыстання воднага транспарта і тым самым падзешавілі перавозкі і аслабанілі чыгуначны транспарт ад лішніх перавозак. Трэба прыстасаваць малыя рэкі да асноўных водных магістралей у мэтах комплекснага выкарыстання ўсёй разгалінаванай рачной сістэмы.

Дзяржплан і яго органы павінны ўвесці планіраванне водных перавозак і строга кантраліраваць ажыццяўленне плана.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны забяспечыць карэнны пералом у рабоце воднага транспарта.

## Дарожная гаспадарка і аўтамабільны транспарт

Дарэвалюцыйная Беларусь была вядома, як краіна бездарожжа. Па ёй вясной і ўвосень нельга было ні прайсці, ні праехаць.

За гады савецкай улады ў Беларусі пабудавана вялікая колькасць культурных, упарадкаваных дарог. У Беларусі зараз ёсць 7.540 км шасейных і ўдасканаленых дарог дзяржаўнага значэння і 1.528 км. шасейных удасканаленых дарог мясцовага значэння і акрамя таго дзесяткі тысяч кіламетраў палепшаных мясцовых дарог. Яны значна палепшылі міжраённыя і міжабласныя сувязі. Нашы дарогі маюць велізарнае гаспадарчае значэнне. Значэнне нашых дарог і неабходнасць іх усямернага развіцця яшчэ больш павялічваецца ў сувязі з тым, што аўтатранспарт Беларусі за апошнія два годы вырас амаль удвая і пачынае займаць усё большае і большае месца ў міжраённых і міжабласных перавозках.

Дзяржава штогод адпускае вялікія сродкі на дарожнае будаўніцтва, на рамонт і падтрыманне дарог у нармальным становішчы.

Клопаты аб дарогах мясцовага і дзяржаўнага значэння заўсёды займалі вялікае месца ў рабоце партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі.

Гэтыя клопаты зараз павінны быць яшчэ больш узмоцнены ў бок павелічэння сеці дарог мясцовага і дзяржаўнага значэння. Трэба ма-

ксімальна развіць ініцыятыву мясцовага насельніцтва ў дарожным будаўніцтве і прымяніць метады будаўнікоў Ферганскага канала. Трэба ўзмацніць увагу да стану дарог, іх рамонту, асабліва ў сувязі з тым, што ў апошні час, як вам вядома, нашы дарогі прынялі на сябе значную нагрузку.

Кожны раён і абласць рэспублікі адказваюць цалкам і поўнасцю за стан дарог і дарожна-транспартных збудаванняў, асабліва мастоў. Трэба выкараніць няправільнае разуменне, што калі дарога дзяржаўнага значэння—магістраль, то аб ёй клапоцяцца толькі зверху. Аб ёй павінны клапаціцца ўсе арганізацыі тэрыторыі, па якой гэта дарога праходзіць ці на якой мост размешчан.

Некалькі слоў аб аўтамабільным транспарце. Аўтатранспартны парк рэспублікі за адчотны перыяд вырас на 96,2 проц.

У 1939 г. быў створан Наркамат аўтамабільнага транспарта, задачай якога з'яўляецца арганізаваць па-дзяржаўнаму эксплаатацыю грузавога і пасажырскага транспарта, ліквідаваць у гэтай справе саматужніцтва, безгаспадарчасць і прывесці аўтатранспарт ў адпаведнасць з вырасшымі задачамі народнай гаспадаркі.

Не гледзячы на тое, што ўжо прайшоў год пасля стварэння Наркамата, ён яшчэ не разгарнуў сваю работу так, каб можна было адчуць паляпшэнне работы аўтатранспарта. На самай справе каэфіцыент выкарыстання аўтамабільнага парка, належачага абласным транспартным трэстам, у 1939 годзе складаў па грузавых машынах 0,155 замест 0,761 па плану, на аўтобусах—0,313 замест 0,739 па плану, па таксі—0,106 замест 0,769 па плану.

Не лепш абстаіць справа і ў другіх аўтагаспадарках.

І, галоўнае, зразумела, тут крыецца не ў тым, чым прабуюць аб'ясніць кіраўнікі аўтатранспарта, спасылаючыся на недахоп гаручага, гумы і т. д., а, галоўнае, у дрэннай эксплаатацыі машын, у адсутнасці правільнага дагляду і тэхнічнага кантролю за станам машын, у дрэннай пастаноўцы рамонту, асабліва, прафілактычнага, у нізкай кваліфікацыі вадзіцеляў машын. Па 4.915 абследваных аўтаінспекцыяй гаспадарках шоферы першага класа складаюць 0,83%, шоферы другога класа—4,9%, а справай перападрыхтоўкі шофераў ніхто не займаецца.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Трэба памятаць, што стан работы аўтамабільнага транспарта, стан аўтамашын—гэта ёсць пытанне абароннае. Незалежна ад чаго-б там ні было, аўтамабільны парк у нас заўсёды павінен быць на хаду і ў спраўным стане.

Наркамат аўтамабільнага транспарта абавязан сканцэнтраваць сваю ўвагу на карэнным паляпшэнні работы аўтамабільнага транспарта, на ўпарадачэнні гаражнай гаспадаркі, арганізацыі своечасовага і добраякаснага рамонту, асабліва сярэдняга і прафілактычнага, на арганізацыі тэхнічнага кантролю за ўтрыманнем і эксплаатацыяй машын, на пастаноўцы справы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў вадзіцеляў і інжынерна-тэхнічных работнікаў.

* * *

Неабходна спыніцца на некаторых агульных недахопах, маючых месца ў прамысловасці, на чыгуначным і водным транспарце.

Велізарны недахоп у рабоце дырэктароў нашых прамысловых прадпрыемстваў, інжынерна-тэхнічнага і адміністрацыйнага персанала і партыйных арганізацый, ажыццяўляючых кантроль над дзейнасцю

адміністрацыі, заключаецца ў тым, што іх клопаты ва многіх выпадках накіраваны, галоўным чынам, толькі на выкананне праграмы па валавому выпуску прадукцыі. Зразумела, выкананне праграмы вельмі важная справа. За выкананне і перавыкананне праграм трэба змагацца і надалей, але пры гэтым нельга паслабляць барацьбы за выкананне плана па якасных паказальніках.

Лічыць тонамі і мільёнамі метраў выпускаемую прадукцыю мы навучыліся. Трэба яшчэ навучыцца лічыць і берагчы дзяржаўную капейку. Трэба добра ведаць, ва што абыходзіцца дзяржаве прадукцыя, работа кожнага прадпрыемства, кожнай арганізацыі. Для гэтага прыдзецца заглядваць у баланс, вывучаць справаздачнасць, клапаціцца аб гаспадарчым разліку.

У нас многа прадпрыемстваў і гаспадарнікаў, якія рапартуюць аб выкананні планаў. І сапраўды, яны з месяца ў месяц выконваюць і перавыконваюць планы. Але гэта не ўсё. Пры праверцы ў некаторых з іх, аказваецца, адсутнічае барацьба за эканомію сыравіны, за зніжэнне накладных расходаў, за эканомію паліва, электраэнергіі, дэфіцытных матэрыялаў. Не заўсёды падтрымліваецца і заахвочваецца вынаходніцкая і рацыяналізатарская мысль рабочых. Няма сапраўднай барацьбы за ўнядрэнне правільнага тэхналагічнага працэса, яго рацыяналізацыю, за сапраўднае аператыўнае міжцэхавае і ўнутрыцэхавае планіраванне. Адсутнічае сапраўдная барацьба за перааҙаленне цяжкасцей у снабжэнні. Няма яшчэ дзейснай барацьбы з бракам і пачуцця адказнасці і гордасці за фабрычна-заводскую марку.

Ёсць выпадкі, калі сацыялістычнае спаборніцтва падмяняеццаараднай шуміхай, прыняццем ва ўрачыстым парадку абавязацельстваў, аб якіх хутка і забываюцца. Некаторыя партыйныя арганізацыі становяцца на шлях падмены адміністрацыі, дробязнай апекі і тым самым паслаблення адзінаначалля, а ў іншых выпадках зусім самаўхіляюцца і фактычна адмаўляюцца ад права кантролю над дзейнасцю адміністрацыі.

Узяць к прыкладу Магілёўскі аўтарамонтны завод. У партыйнай арганізацыі гэтага завода было нямала шуміхі аб разгортванні спаборніцтва, аб кантролі над дзейнасцю адміністрацыі, вынасілася многа рашэнняў, якія стракацяць такімі пунктамі, як «прапанаваць, указаць, папярэдзіць». Ад гэтай шуміхі ствралася ўяўленне аб нейкай дзейнасці, аб інтарэсе да вытворчасці. А на самай справе на заводзе велізарны вытворчы брак, зусім нецярпімая цякучасць рабочай сілы, адсутнасць дысцыпліны, безгаспадарчасць, дрэнная якасць прадукцыі. Завод у 1939 г. і І квартале 1940 г. не выканаў праграму. На кіруючыя звённі ў вытворчасці пранікалі яўна авантурысцкія элементы. Справы на заводзе пачалі выклікаць сур'ёзную трывогу. Магілёўская гарадская партыйная канферэнцыя правільна звярнула ўвагу гарадскога камітэта партыі на нецярпімае становішча спраў на заводзе і на стан работы ў заводскай партарганізацыі.

Каб правільна кіраваць дзейнасцю прадпрыемства, недастаткова ведаць толькі агульныя даныя аб яго рабоце. Трэба глыбока вывучаць планіраванне, эканоміку, фінансы, тэхналагічны працэс. Да ўдзелу ў кантролі павінны прыцягвацца ўсе звенні партыйнай арганізацыі, усе комуністы. Неабходна інфарміраваць комуністаў аб рабоце прадпрыемства, чутка прыслухоўвацца да іх сігналаў. Трэба падняць ролю цэхавых партыйных арганізацый у ажыццяўленні кантролю. Партыйная арганізацыя, валодаючы моцнымі шчупальцамі ва

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ўсім вытворчым арганізме, павінна і можа ў час знайсці ўзнікаючыя новыя з'явы і не толькі сігналізаваць, але дабівацца на месцы канкрэтных дзеянняў.

Паказальны ў гэтых адносінах прыклад завода ім. Варашылава. Партыйная арганізацыя завода сумела вывучыць вытворчасць і правільна зразумела свае задачы. Перш за ўсё яна дапамагала дырэкцыі завода правільна расставіць кадры і вылучыць на кіруючую работу стаханаўцаў, інжынераў і тэхнікаў, здольных рушыць вытворчасць наперад. Комуністы абучаюць рабочых стаханаўскім метадам працы. Многія рабочыя, раней адстаўшыя, сталі стаханаўцамі. З 642 рабочых завода 614 выконваюць і перавыконваюць нормы, у тым ліку ўсе члены і кандыдаты партыі. Роля і адказнасць комуністаў на вытворчасці павысілася. Па ініцыятыве комуністаў на заводзе разгарнуўся рух многастаночнікаў. Завод у гэтым годзе асвоіў складанейшыя станкі новага тыпу.

Партыйная арганізацыя, ажыццяўляючы кантроль над гаспадарчай дзейнасцю, не падмяняе адміністрацыю, наадварот, усямерна ўмацоўвае яе ролю і аўтарытэт, умацоўвае адзінаначалле.

Пытанні вытворчасці часта абмяркоўваюцца на партыйных сходах. Партыйная арганізацыя ўмее змагацца за выкананне прынятых рашэнняў і дзейсна ажыццяўляе кантроль.

Задача ўсіх партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб яшчэ больш узмацніць свой уплыў і кіруючую ролю ў выкананні вытворчых планаў і ўсебаковым паляпшэнні дзейнасці нашых прамысловых прадпрыемстваў.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## II. Сельская гаспадарка

Сельская гаспадарка Беларускай ССР прадстаўляе сабой механізаваную социялістычную гаспадарку, узброеную магутным паркам трактараў і складаных сельскагаспадарчых машын.

9.648 калгасаў, еднаючых 750.000 сялянскіх гаспадарак, ці 92 проц. ад усёй колькасці гаспадарак, маюць у сваім распараджэнні 97,6 проц. усёй пахатнай зямлі, у той час як аднаасобнікі, якія складаюць 8 проц. усіх гаспадарак, маюць у карыстанні 75.000 га зямлі, ці 2,3 проц. усіх пасеўных плошчаў.

Адчотны перыяд быў перыядам далейшага ўздыму социялістычнай сельскай гаспадаркі, арганізацыйнага і гаспадарчага ўмацавання калгасаў, росту калгаснай вытворчасці, росту палітычнай і вытворчай актыўнасці калгасных мас, умацавання дзяржаўнай дысцыпліны і паляпшэння справы загатовак сельгаспрадуктаў.

ЦК ВКП(б), урад і асабіста таварыш Сталін штодзённа клапаціліся і аказвалі велізарную дапамогу сельскай гаспадарцы Беларусі.

Кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і барацьба за далейшы яе ўздым складалі адну з галоўных задач работы партыйнай арганізацыі і Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б.

За адчотны перыяд у сельскай гаспадарцы партыйнымі і савецкімі арганізацыямі і зямельнымі органамі праведзены многія мерапрыемствы, якія, па-першае, значна рушылі сельскую гаспадарку наперад і, па-другое, заклалі сур'ёзнейшыя асновы для яе далейшага бурнага развіцця.

Галоўнейшыя з гэтых мерапрыемстваў наступныя:

Праведзена значная работа па ўцягненню ў калгасы аднаасобнікаў.

З 1 студзеня 1938 года па 1 ліпеня 1939 года ў калгасы ўступіла каля 70.000 гаспадарак, і працант калектывізацыі ў сувязі з гэтым павысіўся з 87,6 да 92 проц.

Аднак, у нас ва ўсходніх абласцях рэспублікі ёсць яшчэ каля 70.000 аднаасобных гаспадарак. Мы павінны і далей працаваць над іх уцягненнем у калгасы. Гэта асабліва адносіцца да партыйных арганізацый Рэчыцкага, Чачэрскага, Барысаўскага, Магілеўскага і Клічаўскага раёнаў, дзе яшчэ адносна ёсць значная колькасць аднаасобных гаспадарак.

## Рэалізацыя рашэнняў Майскага Пленума ЦК ВКП(б) 1939 г.

Партыйныя арганізацыі правялі вялікую работу па далейшаму арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню сельскагаспадарчай арцелі, развіццю і ўмацаванню грамадскай уласнасці калгасаў. Галоўным у гэтай справе была рэалізацыя рашэнняў Майскага Пленума ЦК ВКП(б): «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» і пастановы ЦК ВКП(б) ад 4.XII 1938 г. «Аб нарушэннях статута сельгасарцелі ў калгасах Беларускай рэспублікі».

Як вядома, Цэнтральны Камітэт ВКП(б) устанавіў наяўнасць сур'ёзных скажэнняў палітыкі партыі ў галіне калгаснага землекарыстання, якія выражаліся ў нарушэннях, галоўным чынам, пункта 2-га статута сельгасарцелі—аб нормах прысядзібных зямель, знаходзячыхся ў асабістым карыстанні калгасных двароў. Гэтыя нарушэнні мелі велізарнае распаўсюджанне ў Беларусі і заключаліся ў тым, каб усякімі незаконнымі шляхамі разбазарваліся і раскрадваліся грамадскія землі калгасаў.

Некаторая частка калгаснікаў, раздуваючы сваю асабістую гаспадарку за лік незаконнага расшырэння прысядзібных участкаў і абзавядзення жывёлай звыш статутных норм, лічачыся калгаснікамі і карыстаючыся нараўне з чэснымі калгаснікамі калгаснай зямлёй, ухіляючыся ад работы ў калгасе, сядзела на шыі ў калгасаў. Такія калгаснікі прабавалі сабе ўрваць пабольш, а калгасу даць паменш.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) зусім правільна канстатаваў, што гэтыя і другія нарушэнні статута сельгасарцелі маглі ўзнікнуць толькі на аснове няправільнага, небольшэвіцкага кіраўніцтва калгасамі з боку мясцовых раённых і абласных партыйных і савецкіх арганізацый, якія замест таго, каб стаяць на варце грамадскай гаспадаркі калгасаў і ахоўваць асноўную крыніцу сілы і моцнасці калгаснага ладу — грамадскія землі калгасаў ад пасягацельстваў прыватнаўласніцкіх элементаў, прадаставілі рашэнне гэтага важнейшага пытання калгаснага жыцця самацёку і нярэдка самі ішлі на паваду рвацкіх элементаў, самі бралі на сябе ініцыятыву ў нарушэннях статута сельгасарцелі.

ЦК ВКП(б) кваліфіцыраваў падобную практыку, як чуждую бальшэвізму, у корані апартуністычную, і патрэбаваў ад мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый безадкладнай ліквідацыі разбазарвання і раскрадвання калгасных грамадскіх зямель, прывядзення зямель прысядзібных участкаў да статутнай нормы, устанаўлення строжэйшага кантролю за недатыкальнасцю грамадскіх зямель калгасаў, рашучага абуздання рвацкіх і спекулятыўных элементаў у калгасах.

Уся маса чэсных калгаснікаў з велізарным задавальненнем сустрэла гэта рашэнне ЦК ВКП(б) і Соўнаркома Саюза. Калгаснікі скрозь

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ўсюды дапамагалі партыйным, совецкім арганізацыям і зямельным органам выяўляць і ліквідаваць скажэнні статута сельгасарцелі.

Пры рэалізацыі гэтых рашэнняў у Беларусі праведзена выпраўленне вялікай колькасці нарушэнняў статута. У рэзультаце выпраўленняў было прырэзана да грамадскіх зямель калгасаў 109.683 гектары, у розны час і разнастайнымі шляхамі незаконна захвачаных з грамадскіх зямель калгасаў.

На калгаснай зямлі наведзен парадак, наладжан учот землекарыстання калгасаў, праведзена адмежаванне прысядзібных участкаў ад грамадскіх зямель калгасаў.

Ліквідаваны нарушэнні статута сельгасарцелі па нормах жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснікаў.

Як відаць з сказанага, праároблена вялікая работа. Аднак, нельга зрабіць вываду, што задача ў нас поўнасцю рашана і што да яе не трэба больш звяртацца. Гэта быў-бы груба памылковы і шкоднейшы для справы вывад. Зараз ёсць сігналы з раду раёнаў, якія сведчаць аб тым, што, прарабіўшы велізарную работу, райкомы партыі і райвыканкомы заспакоіліся і аслабілі кантроль, а так як не ўсе яшчэ калгаснікі аслабаніліся ад прывычак і традыцый, унаследваных ад дробнай аднаасобнай, індывідуальнай гаспадаркі, нарушэнні пачынаюць узнікаць зноў. Таму трэба і далей у штодзённай рабоце правяраць выкананне рашэнняў Майскага Пленума ЦК ВКП(б) «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

## Ссяленне хутароў — буйны крок у бальшэвіцкім умацаванні калгасаў Беларусі

Сярод мер, накіраваных да бальшэвіцкага ўмацавання калгасаў, праведзеных за адчотны перыяд, велізарнае значэнне мае ссяленне хутарскіх гаспадарак.

Трацкісцка-бухарынскія і буржуазна-нацыяналістычныя прадажныя агенты на працягу многіх год прабавалі падрываць справу калгаснага будаўніцтва ў БССР, яны ставілі ўсялякія рагаткі на шляху гаспадарчага развіцця калгасаў.

Лелеючы жалкія планы рэстаўрацыі капіталізма ў Беларусі, ворагі народа прадпрымалі ўсё, што было ў іх сілах для насаджэння ў Беларусі хутароў, разлічваючы, што хутары з'явяцца базай, на аснове якой можа быць ажыццёўлена адраджэнне кулацкіх гаспадарак.

Партыя бязлітасна разграміла гэтых злейшых ворагаў народа. Перад партыйнай арганізацыяй Беларусі паўстала ва ўвесь рост пытанне аб ліквідацыі вынікаў іх варожай работы, ліквідацыі хутаршчыны.

Хутары прадстаўлялі сур'ёзнейшую перашкоду справе ўмацавання грамадскай гаспадаркі, яны аслаблялі калгасы. Калгаснікі, пражываючыя на хутарах, замыкаліся ў сваёй уласнай гаспадарцы. Хутары перашкаджалі правільна выкарыстаць і арганізаваць працу, тармазілі механізацыю і асабліва ўвядзенне правільных севаабаротаў, зніжалі прадукцыйнасць усёй калгаснай вытворчасці, у значнай ступені стрымлівалі калектывізацыю аднаасобнікаў, пражываючых на хутарах.

У Беларусі на 1938 г. лічылася 160.000 хутароў. Аднак, праверка ў ходзе ссялення паказала, што фактычна хутароў было 177.000.

Аж да XVII з'езда КП(б) Беларусі ссяленне хутароў усяляк

затрымлівалася, устаноўлены план ссялення на 1938 год 30.000 хутароў да XVII з'езда партыі быў выканан толькі на 10 проц.

Пасля XVII з'езда партыі з ліпеня па снежань месяцы было сселена звыш 20.000 хутароў. Гэта лічылася ў нас у той час вялікім дасягненнем. Аднак, з пункту гледжання інтарэсаў далейшага ўмацавання калгасаў, такія тэмпы ссялення з'яўляліся яўна недастатковымі.

ЦК ВКП(б) і асабіста таварыш Сталін указалі на гэтыя недахопы, падсказалі, дапамаглі ацаніць палітычна востра недапусцімасць далейшага зацягвання ссялення хутароў і патрэбавалі ссялення ўсіх хутароў у бліжэйшыя два годы, устанавіўшы план ссялення на 1939 год 90.000 хутарскіх гаспадарак і на 1940 год—44.000 хутарскіх гаспадарак.

Пасля рашэнняў ЦК ВКП(б) і Ліпеньскага Пленума ЦК КП(б)Б, які абмяркоўваў пытанне аб ссяленні хутароў, усе кіруючыя партыйныя і совецкія работнікі абласцей і раёнаў зразумелі, што ссяленнем хутароў яны рашаюць адну з галоўнейшых задач большэвіцкага ўмацавання калгасаў, навядзення парадку на калгаснай зямлі і правільна, па-большэвіцку арганізавалі работу.

Глыбачайшае адабрэнне калгаснікамі гэтага мерапрыемства, велізарнае жаданне ссяліцца ў калгасныя цэнтры, правільнае арганізацыйнае і палітычнае кіраўніцтва гэтай справай і самаадданая работа нізавога актыва: старшынь калгасаў, сельсоветаў, брыгадзіраў, асабісты прыклад комуністаў і комсамольцаў сялян, а таксама велізарная дапамога, аказаная гарадамі,— вызначылі поўны поспех ссялення.

За лета і восень 1939 года сселена ў калгасныя цэнтры і поўнасцю адбудавана 110 тысяч гаспадарак, ці 20.000 больш зацверджанага планам.

Калгасныя сяленні планіраваліся і будаваліся на аснове новых адносін і культурна-бытавых патрэбнасцей, якія склаліся ў калгаснай вёсцы.

На 1940 год асталося ссяліць 44.000 хутароў, 30.000 з іх прыпадае на Віцебскую вобласць. Большэвікі Віцебскай абласці павінны з гэтага зрабіць адпаведныя вывады.

Трэба поўнасцю выкарыстаць вопыт ссялення мінулага года з пункту погляду арганізацыі ссялення і дапамогі ссяляючымся калгаснікам.

Няма сумнення ў тым, што большэвікі Беларусі і ў гэтым годзе з задачай ссялення хутароў паспяхова справяцца, і такім чынам будзе ажыццёўлена поўнасцю адно з найбольш важных мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы Беларусі з часу калектывізацыі.

## Увядзенне правільных севаабаротаў

Важнейшай умовай забеспячэння росту і ўстойлівасці ўраджаяў з'яўляецца ўнядрэнне правільных севаабаротаў.

Нарэзкай палёў севаабаротаў ва многіх калгасах Беларусі пачалі займацца яшчэ з 1932 г. На 1937 г. было зрасходвана на гэтую справу 17 млн. руб. дзяржаўных і калгасных сродкаў. Гэта работа ў абсалютнай большасці выпадкаў праводзілася няправільна. У радзе калгасаў за гэты перыяд севаабароты ўводзіліся па 2—3 разы. Уся справа зводзілася да механічнай нарэзкі палёў без унутрыкалгаснага землеўпарадкавання. Пры ўвядзенні такіх «севаабаротаў» зусім не

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ўлічваліся перспектывы далейшага развіцця асноўных галін сельскагаспадарчай вытворчасці. Работа па іх унядрэнню праводзілася без удзелу калгаснікаў. Засеўшыя ў зямельных і іншых органах шкоднікі ўсямерна заблытвалі севаабароты, дыскрэдытавалі іх перад калгаснікамі, прыкладалі ўсе намаганні для таго, каб разагнаць кадры землеўпарадкавацеляў з тым, каб і ў будучым затрудніць работу па ўвядзенню севаабаротаў.

У сучасны момант створана моцная база для ўвядзення правільных севаабаротаў:

разгромлены і знішчаны ворагі, якія зрывалі і заблытвалі севаабароты;

значна ўмацаваліся і выраслі калгасы, калгаснікі разумеюць значэнне правільнага севаабароту і неабходнасць яго ўнядрэння;

значна змяніўшаяся структура пасеўных плошчаў, перш за ўсё па лініі павелічэння пасеваў кармовых, тэхнічных, агародніх культур і травасеяння, стварыла зусім рэальную глебу для ўнядрэння правільных севаабаротаў.

Рашэнне ЦК ВКП(б) і Соўнаркома Саюза аб парадку планіравання зернавых культур у калгасах ліквідавала існаваўшую супярэчлівасць паміж складаемымі планамі пасеваў і ўводзімымі севаабаротамі. Цяпер, зыходзячы з агульнага плана сяўбы, па асобных культурах плануюць самі калгасы, значыць, яны маюць поўную магчымасць захоўваць уведзеныя севаабароты.

І, нарэшце, унесена поўная яснасць у пытанне аб тым, якімі павінны быць уводзімыя правільныя севаабароты ў калгасах Беларусі і як іх уводзіць. Практыка даказала, што ва ўмовах Беларусі павінны ўводзіцца пераважна 7—8-польныя севаабароты з чыстымі і чорнымі папарамі і травасеяннем і для некаторых месц Магілеўскай і Гомельскай абласцей—9-польныя севаабароты, таксама з прымяненнем чыстых і чорных папараў і травасеяннем.

Прынятае Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і Соўнаркомам Саюза рашэнне аб увядзенні правільных севаабаротаў у калгасах і соўгасах Украіны павінна быць пакладзена ў аснову далейшай работы па распрацоўцы і ўвядзенню правільных севаабаротаў у Беларусі.

Партыйныя арганізацыі, савецкія і зямельныя органы правялі вялікую работу за адчотны перыяд па ўнядрэнню правільных севаабаротаў.

У 1938 г. упершыню былі ўведзены правільныя севаабароты ў 1.463 калгасах. У 1939 г. былі праведзены дадатковыя мерапрыемствы па ўпарадкаванню работы па ўвядзенню правільных севаабаротаў у калгасах і ўведзены правільныя севаабароты ў 2.138 калгасах. Такім чынам, мы маем па рэспубліцы 3.601 калгас, у якіх уведзены правільныя севаабароты на аснове ўнутрыкалгаснага землеўпарадкавання.

На 1940 год устаноўлен план увядзення севаабаротаў у 2.500 калгасах. Гэты план павінен быць выканан. Пры гэтай ўмове правільныя севаабароты будуць у 6.100 калгасах. У 1941 г. правільныя севаабароты павінны быць уведзены ва ўсіх астатніх калгасах Беларусі.

Гэтым канчаткова будзе наведзен большэвіцкі парадак на калгасных землях і створаны ўмовы для атрымання высокіх і ўстойлівых ураджаяў

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы